# Таямнічы вечар у пана Завальні

Урачыстасць у гомельскай гарадской бібліятэцы імя А. І. Герцэна сабрала гасцей з розных краін свету і нават эпох.




Баль у шляхціча Завальні



Прыгажуня з рыбіным хвастом

Каго там толькі не было: усмешлівыя паненкі і сялянкі, сярэдневяковыя рыцары і іх вытанчаныя дамы, фантастычныя персанажы з апавяданняў Яна Баршчэўскага. На імгненне здалося, што апынулася ў казцы.

У гэты вечар весяліліся не ў бібліятэцы, а ў сапраўдным старадаўнім замку. На ўваходзе ў стылізаванай сажалцы млява пазірала на людзей русалка. Маленькія наведвальнікі, якія разам з бацькамі зазірнулі да шляхціча, круціліся каля прыгажуні з рыбіным хвастом, кожны хацеў зрабіць фота на памяць.

На другім паверсе загучала музыка, і народ паспяшыў на прыём да знакамітых вяльможаў.

Баль у пана Завальні сапраўды атрымаўся — яркі, відовішчны, з размахам. Не кожны дзень убачыш цыркавыя выступленні, рыцарскі паядынак і фламенка на адным свяце. Паспрабуеш у траўніцы духмяную гарбату, паслухаеш вершы і ўрыўкі з класічных твораў, паглядзіш п'есу, а потым апынешся ў падзямеллі замка і, прайшоўшы жудасныя выпрабаванні, знойдзеш закляты скарб.

Дзецям у таямнічым замку таксама было дзе пазабавіцца: іх запрасілі ў краіну Каламбурыю, тут кот Леапольд паказаў, як трэба рабіць кашачую зарадку і лавіць мышэй.

На дзівосны вечар да Завальні зазірнулі замежныя госці. Індыйскія і туркменскія студэнты з Гомельскага медыцынскага ўніверсітэта наведваюць бібліяночы не ўпершыню, і кожны раз — захаплене беларускімі традыцыямі і гасціннасцю. Пасля заканчэння вучобы яны вязуць на сваю радзіму яркія ўражанні і цікавыя гісторыі пра Беларусь. Дарэчы, маладыя людзі распавялі, што многія прадметы побыту ў нас падобныя: ім знаёмы жорны і скрыні, старадаўнія прасы і многае іншае.

У літаратурнай гасцёўні для шляхціча Завальні і абаяльных паненак чыталі свае творы гомельскія пісьменнікі, расказвалі гумарыстычныя выпадкі з жыцця.

Выдатны дадатак, які, зрэшты, рабіў урачыстасць рэалістычнай і самабытнай, — карцінныя і фотавыставы. Атмасфера ў бібліятэцы была амаль чароўнай, па-сапраўднаму сяброўскай і цёплай. І гэта зразумела: тут не было выпадковых людзей, толькі аднадумцы, паплечнікі, творцы і знаўцы беларускай культуры.

Вельмі ўразілі работы народных майстроў: упрыгожанні, зброя, абрадавыя лялькі, вырабы з дрэва — грабеньчыкі, кулоны, шпількі, запісныя кніжкі ў скураных вокладках — і ўсё без выключэння выдатнай якасці.

Супрацоўнікі бібліятэкі правялі каласальную работу па падрыхтоўцы бібліяночы, а гэта было сапраўднае свята, спытайце ў гасцей.

**Юлія ПАДДУБІЦКАЯ**
**Фота Аляксея ГЕРАСІМЕНКІ**